УРОКІ ЖЫЦЦЯ МІКАЛАЯ ДЗЕМЯНЦЕЯ

Два дні таму ў Мінску развіталіся з палітыкам і дзяржаўным дзеячам, старшынёй Вярхоўнага Савета БССР у 1990—1991 гадах Мікалаем Дземянцеем. Мікалай Іванавіч пайшоў з жыцця 10 ліпеня, яму было 88 гадоў. Ён прайшоў шлях ад агранома МТС у Полацкім раёне да старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і намесніка старшыні Вярхоўнага Савета СССР.

Быць першай асобай Беларусі яму выпала ў няпросты час — у пачатку 90-х. Менавіта пад яго кіраўніцтвам Вярхоўны Савет рэспублікі ў 1990-м прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. Пасля жнівеньскага путчу ў 1991-м ён, падтрымаўшы Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы, застаўся верны сваім перакананням і сышоў у адстаўку, саступіўшы крэсла свайму намесніку Станіславу Шушкевічу. Многія яго паплечнікі і людзі, якія асабіста ведалі Дземянцея, успамінаюць Мікалая Іванавіча як выключна прыстойнага і сумленнага чалавека з добразычлівым і мяккім характарам. Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, ён напісаў кнігу ўспамінаў «Урокі жыцця». Мы пагарталі яе і прыгадалі значныя для нашай краіны падзеі, сведкам і ўдзельнікам якіх быў аўтар.

Аб родных мясцінах

Мікалай Дземянцей нарадзіўся ў маі 1930 года на Віцебшчыне, у Чашніцкім раёне. *«Жылі мае бацькі ў пасёлку Рэчкі калгаса «Свабода» Вяцерскага сельсавета Чашніцкага раёна. Пасёлак быў пабудаваны на беразе ракі Свячанка ў 1922 годзе»*. Пасля бацькі пераехалі ў суседнюю вёску. Дзяцінства хлопчыка было апалена вайной. Ён скончыў тэхнікум і працаваў затым у розных раёнах, але родныя мясціны і Віцебшчыну ўспамінаў заўсёды. *«Самыя светлыя ўспаміны пра мясціны, дзе прайшло маё дзяцінства, захаваў і да гэтай пары. Калі мне становіцца цяжка, парушаецца сон і адпачынак, я ў думках пераношуся на прасторы, дзе нарадзіўся і рос, і атрымліваю дзіўную палёгку»*. Адметна, што ў заключным слове ў Авальнай зале, пасля галасавання за яго адстаўку, Мікалай Дземянцей, развітваючыся, падзякаваў жыхарам роднай Віцебшчыны, падтрымку якіх ён адчуваў заўсёды.

Аб першых асобах БССР і СССР

Мікалай Дземянцей працаваў поплеч з першымі асобамі БССР Пятром Машэравым, Ціханам Кісялёвым і Мікалаем Слюньковым. У кожнага з іх быў свой стыль кіраўніцтва.

Забаўны эпізод апісвае аўтар успамінаў з тады яшчэ сакратаром ЦК КПСС Міхаілам Гарбачовым. *«Прыехаўшы напярэдадні правядзення семінару ў Мінск, Міхаіл Сяргеевіч выказаў жаданне дзенебудзь папаляваць. Яго адвезлі ў Белавежскую пушчу, экіпіравалі, выдалі карабін з аптычным прыцэлам. Магчыма, перад паляваннем яго няправільна праінструктавалі, як абыходзіцца са зброяй, магчыма, ён няправільна прыставіў яе да пляча, але факт застаецца фактам: пры аддачы карабіна пасля стрэлу акуляр прыцэла моцна ўдарыў Міхаіла Сяргеевіча пад вока, на твары ўтварыўся вялізны ліловы сіняк. Як кажуць, рана не смяротная, калі б не адна акалічнасць. На наступны дзень Міхаіл Сяргеевіч мусіў выступаць у саліднай аўдыторыі, больш за тое, ставіць задачы міністрам. Карацей, прыйшлося звяртацца да касметолагаў, якія наклалі на рану крэмавую маску. Здаецца, большая частка ўдзельнікаў семінара так і не заўважылі злашчасны сіняк. Праўда, твар Міхаіла Сяргеевіча ў той дзень быў нейкі не па сезоне загарэлы»*.

Аб чарнобыльскай катастрофе

Апісвае Мікалай Дземянцей (на той час сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, які курыраваў аграпрамысловы комплекс) і падзеі вясны 1986 года. *«У тую вясну мне прыходзілася практычна штодзень выязджаць у камандзіроўкі, каб не дапусціць збояў пасяўнога канвеера. Нічога не ведаючы пра тое, што здарылася ў гэту ноч на Чарнобыльскай атамнай станцыі, мы за дзень праехалі Магілёўскую вобласць з усходу на захад. На шляху не раз спыняліся, выходзілі з машыны, глядзелі ўсходы, размаўлялі з сялянамі, не заўважаючы, што на ўсіх нас ужо садзіцца нябачны смяротна небяспечны пыл... Позна ўвечары 26 красавіка ў рэспубліцы пачаліся нейкія незразумелыя перабоі з падачай электраэнергіі, хоць па іх наўрад ці магчыма было меркаваць, што ў краіне здарылася штосьці незвычайнае. Назаўтра, у нядзелю, усё таксама было спакойна. Многія гараджане, і я ў тым ліку, выехалі на дачныя ўчасткі... У панядзелак раніцай у кабінет да М. Слюнькова зайшоў адзін з вядучых спецыялістаў рэспублікі ў галіне ядзерных даследаванняў (цяпер акадэмік) Васіль Несцярэнка і паведаміў, што прыборы, якія маюцца ў атамшчыкаў, зафіксавалі над тэрыторыяй Беларусі, у тым ліку і над Мінскам, павышаны радыяцыйны фон. М. Слюнькоў тут жа патэлефанаваў першаму сакратару кампартыі Украіны У. В. Шчарбіцкаму.*

— Уладзімір Васільевіч, у цябе ўсё спакойна? — пацікавіўся ў суседа.

— Які ўжо тут спакой, Мікалай Мікітавіч, на Чарнобылі аварыя.

Цяпер Слюнькову ўсё стала зразумела: і нечаканыя адключэнні электраэнергіі, і павышаны радыяцыйны фон. Незразумелым заставалася маўчанне Масквы... Праз нейкі час стане вядома, што прычынай затрымкі інфармацыі аб трагедыі стала адсутнасць адзінства ў Палітбюро ЦК КПСС у тым, як паведаміць гэту вестку свайму народу і сусветнай супольнасці. Два дні ў кіраўніцтве краіны не маглі выпрацаваць дакладную пазіцыю па гэтым пытанні. Толькі пасля таго, як міністр замежных спраў Грамыка сказаў, што на стале прэзідэнта ЗША ўжо двое сутак ляжаць зробленыя са спадарожніка здымкі пашкоджанага рэактара, было прынята рашэнне аб перадачы па каналах ТАСС кароткага паведамлення. Наступны дзень Слюнькоў правёў у меркаванай зоне забруджання, наведаўшы Брагінскі і Хойніцкі раёны. Пасля святочнага шэсця ў сталіцы першы сакратар ЦК КПБ зноў паляцеў на Гомельшчыну і праінфармаваў старшыню Савета Міністраў СССР Мікалая Рыжкова, што кіраўніцтва рэспублікі мае намер пачаць эвакуацыю насельніцтва. Рыжкоў не пярэчыў. Ужо потым, пасля ад'езду Мікалая Слюнькова ў Маскву, з'явіцца нямала домыслаў, быццам бы першы сакратар ЦК КПБ у першыя дні адседжваўся ў кабінеце, бяздзейнічаў, кінуў людзей на волю лёсу. Па яго працоўным графіку можна прасачыць, наколькі насычанымі былі тыя дні... Заадно хачу развеяць і яшчэ адзін міф, што існуе і цяпер, аб быццам бы меўшым месца расстрэле радыёактыўнага воблака, якое рухалася на Маскву і Ленінград, а па іншых крыніцах, на краіны Захаду, над тэрыторыяй Беларусі. У першыя дні трагедыі і пасля я неаднойчы заводзіў гэту гутарку з вышэйшым кіраўніцтвам Саюза, размаўляў з вучонымі, ваеннымі. Ніхто з іх не пацвердзіў гэты факт. Не знайшоў пацвярджэння і ў партыйных, дзяржаўных дакументах таго часу. У тыя першыя гадзіны ўсім даводзілася думаць аб тушэнні рэактара, а не аб рассейванні радыеактыўнага воблака».

Аб дзяржаўным суверэнітэце

Гістарычны для нашай краіны дакумент — Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце — быў прыняты 27 ліпеня 1990 года народнымі дэпутатамі Вярхоўнага Савета БССР XII склікання. *«Самыя вострыя спрэчкі ў Авальнай зале, як я і меркаваў, выклікаў 11-ы артыкул, які датычыўся захавання членства нашай рэспублікі ў Саюзе ССР»*. Калі артыкул быў пастаўлены на галасаванне, група дэпутатаў на чале з Зянонам Пазняком і Станіславам Шушкевічам, якія былі супраць СССР, пакінула залу з воклічамі «Ганьба!», але сарваць прыняцце дэкларацыі ім не ўдалося.

Аб камандзіроўцы ў Вільнюс

У першай палове студзеня 1991 года будынак радыё і тэлебачання ў Вільнюсе захапілі сілы, якія выступалі за аддзяленне літоўскай рэспублікі ад СССР. У складзе дэлегацыі, якая павінна была разрадзіць напружаную палітычную абстаноўку, у Вільнюс паехаў і Мікалай Дземянцей. *«Перад будынкам Вярхоўнага Савета рэспублікі нас сустрэў шматлюдны ўзбуджаны натоўп. У цэнтры плошчы гарэў касцёр, уваход у будынак загароджвалі цяжкія бетонныя блокі і пліты»*. Зняць пагрозу ўзброенага канфлікту тады ўдалося. Праўда, праз два месяцы Вярхоўны Савет Літвы прыняў рашэнне аб выхадзе са складу СССР.

Аб падзеях 19—21 жніўня 1991 года

Аб тым, што ў краіне арганізаваны Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (больш звыклая абрэвіятура — ГКЧП (ДКНС)), Мікалай Дземянцей даведаўся па радыё. *«Хутка сабраўшыся, я прыехаў на работу. Толькі пераступіў парог кабінета, як пачаліся званкі. Патэлефанаваў старшыня КДБ СССР Уладзімір Кручкоў (член ДКНС. — Аўт.). Яго цікавіла сітуацыя ў Беларусі. Я адказаў, што ніякіх праблем няма, і яны, хутчэй за ўсё, не ўзнікнуць.»* Але так званы путч скончыўся бясслаўна: вынікаў ён не прынёс, а яго арганізатары былі адпраўлены ў турму. *«Сёння можна казаць, што дзеянні ДКНС не мелі карыслівых інтарэсаў. Гэтымі дзеяннямі кіравала разуменне таго, што з перабудовай не ўсё ў парадку»*, — робіць выснову Мікалай Дземянцей. Ён падтрымаў ДКСН, а ўжо на наступны дзень пасля заканчэння путчу, 22 жніўня, вымушаны быў пайсці ў адстаўку. Пасля ў інтэрв'ю ён прызнаваўся, што калі б застаўся ва ўладзе, Белавежскіх пагадненняў не падпісаў бы.

Алена КРАВЕЦ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 235,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Начальная цена продажи – 102 570 руб. (сто две тысячи пятьсот семьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 10 257 руб. (десять тысяч двести пятьдесят семь рублей)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 16 августа 2018 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 13 августа 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «Гофробум», 223013, Минский район, Минская обл., д. Василевщина, здание зернохранилища № 2, к. 3

Предмет аукциона

Лот № 1 – объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, пер. Менделеева 1-й, 50 (2, 3)

Наименование (Назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Помещение общественного питания	635,2	500/D-708163897
Складское помещение	111,1	500/D-708163898

Начальная цена с НДС 20 %: 365 687,00 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

Лот № 2 – объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Вишневецкого, 8а (3, 4)

Нежилое изолированное помещение (помещение, не относящееся к жилищному фонду)	36,9	700/D-101889
Нежилое изолированное помещение (помещение, не относящееся к жилищному фонду)	884,8	700/D-101888

Начальная цена с НДС 20 %: 368 680,00 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

Лот № 3 – изолированное помещение, по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Турова, 5-11

Административное помещение	32,9	700/D-128423

Начальная цена с НДС 20 %: 19 740,00 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**15.08.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**13.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**